# Там, дзе жывуць яго персанажы

Кузьма Чорны... Колькі шчаслівых хвілін, хвілін роздуму, перажывання звязана ў кожнага чалавека з гэтым імем.

За дваццаць адзін год сваёй нястомнай літаратурнай дзейнасці Кузьма Чорны напісаў дзесяць кніг апавяданняў, пятнаццаць раманаў і аповесцей, некалькі п'ес, вялікую колькасць нарысаў, фельетонаў, публіцыстычных і літаратурна-крытычных артыкулаў.

Кузьма Чорны рос і гадаваўся ў асяроддзі простых людзей фізічнай працы, для якіх, як успамінаў пасля сам пісьменнік, «кавалак хлеба і палатняная кашуля адна на год здаваліся шчасцем. Так жылі ўсе тыя людзі, сярод якіх я вырас і выхаваўся. Так жыў народ».

Усім сваім жыццём і ўсёй творчасцю К. Чорны быў звязаны з гэтымі людзьмі, служыў ім. Ён горача любіў свае родныя мясціны — Цімкавічы, горача любіў свой народ і яго мову. «Родныя мае мясціны, — пісаў празаік. — Там жывуць усе мае персанажы. Усе дарогі, пейзажы, дрэвы, хаты, чалавечыя натуры, пра якія я калі-небудзь пісаў. Гэта ўсё адтуль, сапраўднае»

Цімкаўцы ганарацца сваім земляком — выдатным пісьменнікам. Ушаноўваючы яго памяць, настаўнікі і вучні Цімкавіцкай адзінаццацігодкі пад кіраўніцтвам былога дырэктара школы, заслужанай настаўніцы школ БССР Зінаіды Іосіфаўны Раманенкі стварылі музей імя Кузьмы Чорнага.

Нядаўна гэты музей стаў дзяржаўным. Ужо праведзены рэстаўрацыйна-рамонтныя работы. А зараз ідзе збор і абагульненне экспазіцыйных матэрыялаў для музея К. Чорнага. У ім працуе мастак Генадзь Рыгоравіч Чысты і навуковы супрацоўнік Лідзія Вітальеўна Макарэвіч.

Жадаючыя наведаць музей даведаюцца шмат цікавых фактаў з жыцця вялікага пісьменніка. Зацікавіць экспазіцыйны комплекс сялянскай хаты, у якой жыў маленькі Мікалай. Як успамінае сястра К. Чорнага Марыя Карлаўна Раманоўская, пасярод хаты стаялі кросны, на якіх ткала маці пісьменніка Гліцэра Міхайлаўна. «Яна была вельмі добрая ткачыха». Ніхто ў Цімкавічах не мог так умела ўкінуць ніткі ў ніты, каб атрымаўся замыславаты, складаны ўзор на сурвэтках і абрусах, як гэта рабілі маці Кузьмы Чорнага і яго дзед Міхал Парыбак — слаўны, выдатны майстар. Гэты экспанат перадала ў музей Вольга Мацвееўна Малібожка з Блеўчыц. З яе слоў яны былі зроблены па ўзору кроснаў дзеда Кузьмы Чорнага.

Я ўдзячная і цімкаўцам І. Я. Шкуцька, І. Саковіч, М. А. Астрэйка, С. Бельскаму, В. Варанковай, што адгукнуліся на просьбу і перадалі ў музей экспанаты.

Адкрыццё музея будзе важнай падзеяй у жыцці людзей, якія захапляюцца літаратурай, мастацтвам, якіх цікавіць творчасць пісьменніка вялікай душы. Запланавана яно на сярэдзіну кастрычніка. Запрашаю ўсіх жадаючых!

**Л. НІЖЭВІЧ,**
дырэктар музея К. Чорнага.